Cana asobnaha numaru 20 hr. | Pierasyłka apłačana ryčałtam.

Nr. 5 (550). | **Wilnia, Niadziela 28 Studnia 1934 h.** | **Hod X (XVIII).**

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adres Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 ran. da 4 hadz. wieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	„Biel. KRYNICA" kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

Савецкія „ведзьмы".

Кожны, хто чытаў гісторыю сярэдніх вякоў Зах. Эўропы, ведае, што тагды было гібель так зв. вядзьмарскіх працэсаў. Калі каго западозрылі ў зносінах з нячыстай сілай, бралі ў турму і там прымушалі „прызнацца" да ўсіх сваіх вядзьмарскіх штук. Была распрацавана нават адумысловая процэдура, паводле якой паступалі ў такіх выпадках. Была напісана і выдана адумысловая кніга, як-бы „кодэкс карнага паступаньня" адносна ведзьмароў і асабліва ведзьмаў, кніга гэта называлася „Malleus maleficarum" („Молат на ведзьмы").

Вось-жа паводле гэтага „Молата" процэдура з ведзьмамі была такая: калі ўлады атрымалі данос, або і так западозрылі якую жанчыну ў вядзьмарскіх штуках, яе заraз-жа арыштоўвалі і пачыналі дапытваць. Допыты адбываліся пасярэднявяковаму: спачатку загадывалі прызнацца да „ўсяго", грозячы рознымі мучэньнямі; калі такая няшчасная жанчына цьвярдзіла аб сваей нявіннасьці, яе бралі на катаваньне: білі, заганялі пад ногці іголкі, а ўрэшце прыпальваці гарачым жалезам, а гэта з тэй мэтай, каб дабіцца ад яе „праўды". Скатаваная і прыпечаная агнём жанчына „прызнавалася" тагды да ўсяго, чаго хацелі каты: казала, што яна была ў зносінах з чортам, што прадала яму сваю душу, што старалася шкодзіць людзям пры помачы нячыстай сілы, і нават прызнавалася да таго, што спала з чортам, як з мужам... Пасьля атрыманьня такіх „прызнаньняў", пісалі акт абвінавачаньня, ладзілі працэс і ў рэзультаце „ведзьму" палілі на агні.

За што іх так каралі? Трэба ведаць, што ў тыя часы калі здарылася якое агульнае няшчасьце, як пошасьць, паводка, неўраджай, пажар, землятрасеньне і г п., то ўсе гэтыя няшчасьці прыпісвалі ведзьмам і былі пракананы, што разам з зьніштажэньнем ведзьмаў згінуць і няшчасьці..

Нешта падобнае цяпер робіцца і ў саветах, толькі ў іншым кірунку: там судзяць не за зносіны з чортам, а за зносіны з буржуазіяй. Западозрыўшы каго ў палітычным „вядзьмарстве", бяруць яго ў Г.П У. і... прызнавайся. Пад тэрорам людзі часта прызнаюцца, як тыя „ведзьмы", да ўсяго, што патрэбна саветам Хто сьлядзіў палітычныя працэсы Рамзіна, Макдональда і інш., той часам ня мог надзівіцца з „прызнаваньняў" розных савецкіх „шкоднікаў". Гэтыя шкоднікі часам болей вінавацілі сябе, чым пракуратура; гаварылі на сябе нябывалыя рэчы. Рабілі гэта яны таму, што спадзяваліся палёгкі і таму што бачылі, што гэта падабаецца савецкім уладам...

У такія савецкія „ведзьмы", якія прызнаюцца да ўсяго, чаго толькі хочуць камуністы, трапілі і „нашы" дзеячы, быўшыя паслы з Грамады і Змаганьня, аб арыштаваньні каторых мы пісалі ў „Б. Крыніцы". Каб ня быць галаслоўнымі, падаём тут з камуністычнай прэсы „прызнаньні" некаторых арыштаваных. Такі напр. Дварчанін пасьля арышту заявіў так:

„Існуючая на Савецкай Беларусі контррэвалюцыйная нацдэмаўская арганізацыя, да якой і я таксама належаў, ставіла перад сабой наступныя мэты і заданьні: зваліць савецкую ўладу ў Б.С.С.Р. шляхам узброенага паўстаньня пры дапамозе польскіх фашыстаў, стварыць буржуазна-дэмократычную беларускую рэспубліку з міністрамі і прэзыдэнтам на чале, уключыць у гэтую Беларускую буржуазную рэспубліку таксама і Заходнюю Беларусь і цесна зьвязацца з фашыстоўскай Польшчай. У гэтай Беларускай Народнай Рэспубліцы мы думалі ўвесьці буржуазную конституцыю, якая-б давала ўсе правы і прывілеі буржуазіі, абшарнікам і кулакам. Мы імкнуліся таксама зноў увесьці капіталістычны лад як у горадзе, так у вёсцы, а значыць аддаць назад капіталістам фабрыкі, забраныя ў іх у часе рэвалюцыі, аддаць назад абшарнікам іх зямлю, сагнаўшы з яе сялян-калгасьнікаў, вярнуць на сваё месца кулакоў, даўшы ім зямлю, якой цяпер карыстаюцца былыя беднякі-калгасьнікі і сяляне аднаасобнікі. Далей мы хацелі скасаваць усе правы, якімі рабочыя карыстаюцца цяпер у Савецкай Беларусі: скасаваць 7—8 гадзінны дзень, социяльнае забясьпечаньне, прафэсыянальныя саюзы і г.д, апроч таго мы хацелі стварыць буржуазнае войска і паліцыю, увесьці буржуазную сыстэму падаткаў, галоўны цяжар перакладаючы на працоўных".

Гэтак „прызнаецца" Дварчанін. А вось і „прызнаньне" другой савецкай „ведзьмы" Рака-Міхайлоўскага:

„Калі мы пераканаліся, што Грамада, наперакор нашым плянам і спадзяваньням, хутка расьце, і масы, ёю агорнутыя, усё больш актыўна выступаюць да барацьбы, польскі фашызм разграміў Грамаду пры дапамозе яе кіраўніцтва".

„Прыхільныя адносіны ангельскіх фінансавых кругоў да прэтэнзіі Германіі на Данцыг і польскі калідор узамен за адступленьне Польшчы Савецкай Украіны паставіла перад нашым Беларускім Цэнтрам у Вільні задачу ўключыць у гэтыя пляны таксама і Савецкую Беларусь. З гэтай мэтай Беларускі Палітычны Цэнтр у Вільні праводзіў настойлівыя перагаворы з прадстаўнікамі польскага ўраду".

А цяпер „прызнаньне" Бурсэвіча:

„Я стаў тайным агентам польскай дэфэнзывы ў чэрвені 1926 году. Я паведамляў пра ўсё, што рабілася ў Грамадзе, а таксама пра ўсё тое, што мне было вядома пра дзеяльнасьць членаў К.П.З.Б. Праз увесь час маей працы ў дэфэнзыве, я атрымоўваў з дэфэнзывы па 300 злотых у месяц аж да таго моманту, калі быў арыштаваны ў студзені 1927 г. Перад арыштам дэфэнзыва абяцала мне, што будзе памагаць маей сям'і ўвесь час, пакуль я буду ў турме. І праўда, Дварчанін амаль што кожны месяц выдаваў маей сям'і па 150—200 злотых.

„У 1930 г. у Вільні ў часе нарады было пастаноўлена, што да моманту, пакуль выбухне вайна паміж Польшчай і С.С Р.Р., якая мае распачацца альбо восеньню 1933 г., альбо вясной 1934 г., я — Бурсэвіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла і іншыя павінны прыгатаваць у Б.С.С.Р. усё, што магло-б запэўніць удачны вынік вайны".

А напасьледак і „прызнаньне" Кахановіча, які відаць быў арыштаваны раней:

„Рак-Міхайлоўскі, Луцкевіч, Астроўскі, Мятла, Валошын і іншыя правадыры беларускага нацыянальнага руху, каб падарваць рэвалюцыйную працу К. П. З. Б., перафарбоўваюцца на рэвалюцыйны колер і на словах стараюцца даказаць свае палявеньне. Усе яны стараюцца прыдаць рэвалюцыйнаму руху на Заходняй Беларусі нацыяналістычны характар. Стараюцца скіраваць яго ў бок згоды і прымірэньня з буржуазнай Польшчай. Рэвалюцыйна-настроеныя масы ўліліся ў арганізацыю Грамады, не падазраваючы таго, што кіраўніцтва Грамады вядзе сваю контррэвалюцыйную работу разам з дэфэнзывай".

„Як беларускі дзеяч — кажа пасол Кахановіч — я зьвязаўся з польскай дэфэнзывай, якую я паведамляў аб беларускім руху ў Заходняй Беларусі і памагаў дэфэнзыве ажыцьцяўляць польскую палітыку ў стасунку да беларусаў".

„Беларускі Нацыянальны Цэнтр, да якога належалі Луцкевіч, Астроўскі, Дварчанін, Рак-Міхайлоўскі і інш. быў зьвязан з польскай дэфэнзывай і дзейнічаў пад яе кіраўніцтвам" — кажа таксама Бурсевіч".

„З самага пачатку свайго існаваньня Беларускі Пасольскі клюб, —кажа ён, — падтрымоўваў польскі ўрад і ставіў перад сабой, як галоўнае заданьне, барацьбу з савецкай уладай і рэвалюцыйным рухам на Заходняй Беларусі. Кіраўнікі Клюбу і ўсе яго члены былі зьвязаны з дэфэнзывай і ўсю працу сваю вялі паводле ўказаньняў дэфэнзывы".

„Мы выступалі з соймавай трыбуны і на мітынгах з апазыцыйнымі і рэвалюцыйнымі прамовамі, але рабілі ўсё гэта толькі для блізіру, каб паказаць масам, што Беларускі Клюб бароніць інтарэсы шырокіх беларускіх мас, а сапраўды паслы Беларускага Клюбу ўвесь час вялі перагаворы з польскім урадам і працавалі ў поўнай згодзе з ім і на яго карысьць".

Вось маем „прызнаньні" чатырох уцекачоў у савецкі „рай". Ня будзем тут ані бараніць іх, ані асуджваць, няхай гэтае робяць тыя, каторыя іх болей знаюць і з імі супрацоўнічалі. Мы толькі паставім пытаньне: якую мэту маюць саветы, узвальваючы на галовы гэтых людзей такія абвінавачаньні?

Мэты даволі простыя: паказаць перад масамі ў саветах, што ўсе гэтыя людзі, каторых яны даўней баранілі і на чэсьць каторых на кожным мітынгу выносілі слаўныя рэзалюцыі, што ўсе яны прадажнікі і контррэвалюцыянэры і што іх ня можна славіць, а трэба іх караць, як шкоднікаў. А каб караць, трэба знайсьці прычыну. — І гэту прычыну цяпер знаходзяць аж гэткім подлым спосабам.

Гэтыя людзі былі патрэбны камуністам тут, у Зах. Беларусі, але там яны ім непатрэбны, бо яны беларусы... І як гэтыя людзі, заехаўшы туды, не стараліся прыпадабацца маскоўскім „валадарам" (асабліва Рак-Міхайлоўскі, аб чым мы пісалі ў перадавіцы папярэдняга (3) нумару нашай газэты), аднак нічога не памагло. Цяпер зьдзіраюць з іх славу мучаніцтва (усе яны сядзелі ў польскіх турмах), а потым? Потым усё можа быць, можа нават Салоўкі, а можа і горай.

Гэтак заўсёды бывае з тымі, якія ідуць на службу да сільных гэтага сьвету, забываючыся аб сваім народзе. Аб гэтым трэба падумаць усім беларусам, а асабліва кандыдатам у савецкія „ведзьмы".

Plany nowaha polskaha asadnictwa.

Niamała ŭžo jość na biełaruskich ziemlach polskich kolonistaŭ — wajskowych asadnikaŭ i wolnych pakupščykaŭ, jakija takim ci inšym sposabam zajmajuć abšary ziamli — poŭnaziamielnyja warštaty pracy pobač z małaziamielnym abo i biezziamielnym biełaruskim sialanstwam. Ab hetym mnoha pisałasia ŭ hazetach, hromka hawaryłasia ŭ sojmawych pramowach, mnoha było pratestaŭ, a na biełaruskaj wioscy ab hetym nie pierastajuć z prykusam hawaryć i ciapier Henaje niezdawoleńnie čuła polskaja dziaržaŭnaja administracyja na biełaruskich ziemlach, chiba-ž čuje i ciapier, čuła i polskaje hramadzianstwa. Mnohija z polskaha hramadzianstwa, pryznajučy polskaje asadnictwa na našych ziemlach kryŭdnym jak dla biełaruskaha sialanstwa, tak i dla biełaruskaha narodu naahuł, nawat wystupali z damahańniem skasawańnia abo ŭstrymańnia hetaha asadnictwa

Adnak paśla stabilizacyi hetaha asadnictwa, u polskich waršaŭskich hramadzkich kruhoch, jak padaje „Kurjer Wileński" (Nr. 11, 1934), paŭstała dumka ab nowym polskim asadnictwie ŭ našym kraju, ale ŭžo nie wajskowaha, a biezrabotnaha; biezrabotnym rabotnikam majuć dawać ziamlu i hetak zrabić z ich ziemlarobaŭ. Ab hetym nowym asadnictwie biezrabotnych „Kur. Wil." piša miž inšym hetak.

„Prajekt asadnictwa na ŭschodnich ziemlach (čytaj: biełaruska-ukrainska-litoŭskich — r e d.) pradbačyć nasadžwańnie asadnikaŭ hrupami, pa niekalka dziesiatkaŭ asob u hrupie, a heta dziela taho, kab lepš jany mahli ŭstajać prad niaprychilna nastrojenaj miascowaj ludnaściaj. Zapas ziamli maje być utworany z dziaržaŭnych abšaraŭ, jakija možna zdabyć pry likwidcyi doŭhu Dziaržaŭnamu Skarbu, pawodle rasparadžeńnia Prezydenta Polskaj Respubliki z dn. 28.X.1933 h. Kožny asadnik dastaŭby chutar ziamli abšaram mienš-bolš 12 hektaraŭ. Na

budoŭlu i zapačatkawańnie haspadarki kožnaj asady pradbačycca kala 5000 zł. Cana ziamli takoha chutaru maje być kala 4000 zł. Razam utwareńnie hetkaj nowaj asady kaštawała-b kala 9000 zł., a hetuju sumu asadniki wypłačwali b praz niekalka dziesiatkaŭ hadoŭ".

Cikawyja woś pahlady hetych waršaŭskich hramadzkich kruhoŭ na našu krainu, jany ŭwažajuć jaje kolonijalnaj terytoryjaj, kudy možna pasłać na pasialeńnie polskich biezrabotnych rabotnikaŭ, nadzialajučy ich na pasialeńni ziamloj. Tymčasam treba wiedać, što hetyja h. zw. uschodnija ziemli nie znachodziacca-ž niedzie ŭ Afrycy, kab ab ich pałažeńni faktyčnym waršaŭskija hramadzkija kruhi nia wiedali, a kali sapraŭdy nia wiedajuć, dyk warta pryhladziecca, a jašče lepš prysłuchacca. Tut u nas žywie husta rassielenaje biełaruskaje i litoŭskaje sialanstwa, katoraje źjaŭlajecca pryrodnym žycharstwam hetaha Kraju. Pobač z biełaruskim sialanstwam pamiž biełaruskich wiosak siadzić u dwary polski abo rasiejski pan, jaki na sialanstwa daŭno straciŭ upływy, bo straciŭ ich razam z pryhonnym bizunom.

Biełaruskaje sialanstwa ŭ bolšaści małaziamielnaje i biezziamielnaje daŭno ŭžo damahajecca sprawiadliwaj ziamielnaj reformy, majučy nadzieju papoŭnić i stwaryć ziamielnyja warštaty pracy z tych zapasaŭ ziamli, jakija stanowiać dwornyja abšary. Pry hetym nacyjanalnaja świedamaść biełaruskaha sialanstwa, katoraja tak chutka paddajecca idejam abaronnaha nacyjanalizmu, stwaraje warunki dla nowaha polskaha asadnictwa na biełaruskich ziemlach prosta niemahčymyja.

Ci polskija waršaŭskija hramadzkija kruhi, wiedajučy ab hetym, swaich planaŭ wyrakucca, hadać nia budziem, ale śladzić za raźwićciom hetych planaŭ i infarmawać naša sialanstwa ab ich musim i budziem.

S. Haras.

Украінская коопэрацыя.

(30-тыя ўгодкі коопэратыўнай працы).

Першую ўкраінскую коопэратыўную праграму абвесьціў В. Нагірный у 1882 годзе ў Галіччыне. Акцыя В. Нагірнага ў супалцы з акцыяй А. Нычая давяла ў 1883 годзе да заснаваньня „Народноі Торговлі,“ як цэнтральнай крамы. У 1898 годзе засноўваецца Крэдытовы Краёвы Саюз, які становіцца асяродкам арганізацыі ўсялякага роду коопэратываў сярод украінскага насельніцтва ў Галіччыне.

У 1904 годзе гэты Саюз набірае права ўстанаўляньня рэвізораў для сваіх саюзных коопэратываў. У тым-жа 1904 годзе паўстае Краёвы Рэвізыйны Саюз, які аб'ядновае 284 коопэратывы з 44.000 сябрамі. У 1907 годзе арганізуецца Краёвы Саюз Малачарскі, які цяпер займае ў украінскім жыцьці пачэснае месца, а пазьней арганізуюцца і іншыя саюзы. У 1911 годзе Краёвы Рэвізыйны Саюз аб'ядновае 4 краёвыя цэнтралі і звыш 500 саюзных коопэратываў з 165.000 сябрамі.

Пасьля вайны Краёвы Крэдытовы Саюз зьмяніў свой статут і стаўся Цэнтральным Коопэратыўным Банкам, а Краёвы Рэвізыйны Саюз пашырыў свой статут і стаўся Рэвізыйным Саюзам Украінскіх Коопэратываў.

Агулам кажучы, украінская коопэрацыя ўжо сільная і яна зьяўляецца адной з галоўных падстаў да сьветлай будучыні народу.

Для Беларусаў гісторыя ўкраінскага коопэратыўнага руху зьяўляецца добрым прыкладам дзеля ўтварэньня аднэй з важных асноў эканамічна-грамадзкага жыцьця — беларускай коопэрацыі.

п—к.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Новы гурток Бел. Інстыт. Гасп. і Культуры. Надовячы заснаваўся ў в. Анісімавічах, Баранавіцкага пав., новы гурток Бел. Інст. Гаспадаркі і Культуры, які цяпер легалізуецца ў адміністрацыйных уладаў. Цяжка паўставаць гэтага роду бел. арганізацыям, аднак беларуская вёска ў гэтым кірунку натужвае сілы. А гэнае натужваньне нашага сялянства і ёсьць зарукай, што нацыянальнай справы ў народзе ўжо ня спыніць.

Лекцыя. У студэнскім „Т-ве Беларусаведы пры У.С.Б.“ у нядзелю 28-га г. м., а гадз. 5-й п. п. адбудзецца чарговая лекцыя на тэму „Беларуская этнографія за 15-ць гадоў“ (1919—1934). Чытае абс. М. Пяцюкевіч. Адбудзецца ў галоўным будынку УСБ., у залі VII-ай.

Зьезд ТБШ і падгатоўка да яго. Даведваемся, што мае незадоўга адбыцца агульны зьезд Т-ва Беларускае Школы. Ініцыятарам цяперашняга зьезду зьяўляецца відомая і нявідомая апазыцыя супроць сучасных сяброў Галоўнай Управы Т.Б.Ш. На віленскім грунце, як нас інфармуюць, гэтай відомай апаратурай зьяўляюцца „слаўныя малайцы“ Тарасюк і Міска, каторыя падгатаўляюць апазыцыю супроць „нацдэмаў“ на зьезд, — каб зьезд ТБШ перадаў галоўную ўладу гэтай арганізацыі кумпаніі, з Карповічам — рэдактарам „Бел. Газэты“ на чале.

Азэфаўшчына працуе — „завешаньне“ Акружной Управы Т.Б.Ш. у Беластоку. Апошнімі часамі азэфаўшчына каля ТБШ. у Беластоку так заварушылася, што гэтым заварушэньнем уцягнула арганізацыю ў такі нерат, што ані ўзад ані ўперад. А выглядае яно менш-больш гэтак. Пачаліся з усіх бакоў, а пераважна з падзямельля, атакі на кіраўніцтва Управай Т.Б.Ш. Нейкі Лешчынскі зьмясьціў адкрытае пісьмо ў „Бел. Газэце“ аб фальшаваньні ў Т-ве Бел. Школы пратаколаў. Гэтымі даносамі зацікавілася паліцыя, а адміністрацыйныя ўлады завесілі дзейнасьць Управы Т.Б.Ш. у Беластоку. Нямала ў гэтай справе памагла і сама „Бел. Газэта.“

Чаго хочам ад царквы?

Адказ на гэтае пытаньне просты; хочам, каб Царква перастала быць асяродкам дэнацыяналізацыі нашага народу і была, згодна свайму назначэньню, школай хрысьціянскіх ідэалаў і жыцьця. Слушнасьць дамаганьняў гэтага ня прыходзіцца абасноўвываць. Тымчасам з усіх закуткаў Зах. Беларусі даходзяць да нас весткі, што значная часьціна прав. духавенства безнаказна займаецца варожым нашаму народу палітыканствам, зьневажаючы найсьвяцейшыя пачуцьці сваіх пасомых. Беларускае праваслаўна-царкоўнае грамадзянства ўжо няраз зьвярталася да Выш. Дух. Уладаў, просячы іх запыніць гэнае нездаровае зьявішча ў жыцьці нашай Царквы. Аднак усе гэныя нехрысьціянскія выступленьні часткі прав. духавенства і да сяньня не запынены.

Не здаволілі Выш. Дух. Улады і тыя просьбы, здаваленьне якіх безпасярэдне залежыць ад іх. Да сяньня няма яшчэ ніякае беларускай праваслаўнай рэлігійнай літэратуры для праваслаўнага беларуса. Да сяньня справа беларусізацыі царкоўнага жыцьця позытыўна ня вырашана; спосаб адношаньня да гэтай справы больш чым непаважны. На ўкраінскіх землях прадбачыцца ўкраінізацыя Царквы (украінізацыя багаслужэньня, правячы епіскап, украінскі склад кансысторыяў і т. д.), а на нашы землі прызначаюцца (згодна з прэсавымі весткамі) архіеп. Панцялейман і епіскап Сымон, абодва ведамыя расейцы.

Гэта факты, якія насоўваюць думкі, што нават і для духоўных Уладаў просьбы, адны толькі просьбы, зьяўляюцца незразумелымі. Ня ўжо пры нашых мінімальных дамаганьнях апрача просьбаў патрэбны яшчэ іншыя выступленьні, можа падобныя пачаеўскім, каб пасьля ўжо Дух. Улады дакорліва абураліся, — чаму гэныя просьбы не адбываліся ў больш лагоднай форме?

Сапраўды, — мы ўсьцяж просім ня зьдзекавацца над нашымі пачуцьцямі, — прамаўляць у беларускай мове пропаведзі ды навучаньне веры, даць народу рэлігійна-ўзгадаваўчую літэратуру, — а нашы просьбы не здаволіваюцца і мусіць толькі таму, што мы толькі просім.

Украінцы атрымоўваюць свайго епіскапа, украінскую мову ў багаслужэньні і т. д. а гэта мусіць таму, што ўмелі ня толькі прасіць...

Вось думкі, якія паўстаюць пры назіраньні шматгадовых нашых просьбаў. Аднак мы яшчэ просім.

Мік. Галубовіч.

Dr. St. Hrynkiewič.

Brušny tyfus.

Chwaroba zaraznaja. Wyklikajuć jaje bakteryi ŭ formie pałačak (zawucca pałački Kocha i Ebertha). Bakteryi łučyŭšy tym ci inšym šlacham da strawatraŭčaha aparatu, u pieršuju čarhu da tonkich kišak, nadta chutka rastuć.

Chworaść wyjaŭlajecca ahulnaju słabaściu, chwory narakaje na bol haławy, nieachwotu da jady, niadužaść. Potym prychodzić trasca, a za jeju haračka, štoraz wialikšaja: pad kaniec I-ha tydnia dachodzić da 40° i bolš. Na druhim tydni chwaroby jazyk žoŭta-biełу, suchi, son trywožny, wialikaja smaha. Temperatura ŭwieś čas wysokaja, kala 40°. Na hetym tydni možna ŭbačyć na bruchu i hrudzioch čyrwonuju wysypku, jakaja prapadaje, kali nacisnuć palcam čyrwonaje miesca, časta pry hetym bywaje suchi kašal. U kiškoch šmat hazaŭ, dziela taho žywot uzduŭšysia, burčeńnie ŭzdoŭž toŭstych kišok, najmacniej pad prawaju padskabnaju wakolicaju. Wyparažnieńni wadzianistyja, koleru harachwianki. Wyparažnieńni nia nadta častyja, 2—4 razy na dzień, biez asabliwych bolaŭ.

Na treci tydzień haračka mienšaja, son lepšy, chwory bolš badziory. Adnak heta najbolš niebiaśpiečnaja para chwaroby. Kali tolki nia budzie naležnaha nahladu za chworym, lohka zrobicca wialiki krywatok u kiškach. Krywatok heny z ranaŭ ŭ tonkich kiškach.

Na čaćwiertym tydni harački ŭžo nia bačym. Chworyja majuć apetyt, samapačućcio štoraz lepšaje.

Pobač z mahčymaściu krywatoku, što źjaŭlajecca najbolšaju tutaka niebiaśpiekaju, mahčymyja jašče i inšyja zaminy na šlachu azdaraŭleńnia — heta mianoŭna: zapaleńnie lohkich, zapaleńnie wucha, u žančyn u ciažku škidyš, asłableńnie serca i h. d.

Padčas traplajecca tak-ža, što tyfus brušny nadta lohki. Haračka zusim niewialikaja, chwory nie pakidaje swaje zaŭsiodnaje pracy. Nažal i ŭ henych lohka chworych možna bajacca tych samych komplikacyjaŭ, z jakich asabliwa ciažkaja — krywatok z pahrozaju śmierci.

Tyfusnyja pałački, jak była ŭžo hutarka, u najbolšym liku razrastajucca ŭ kiškach. Zhetul jany mohuć łučyć u sielazionku, u kroŭ, a z krywi da nyrak (bakteryi buduć u mačy), da lohkich (bakteryi ŭ ślinie i sploŭkach chworaha). Zrazumieła, što ŭ pieršuju čarhu buduć pałački ŭ wyparažnieńniach.

Ważna, kab dobra mieć na ŭwiecie henyja mahčymaści zarazy, kab najlahčej abaranicca ad chwaroby. Dyk usie wyparažnieńni, sploŭki sabirać u asobnuju pasudzinu, dobra dezynfekawać (zabiwać, ačyščać ad bakteryjaŭ) i potym wyliwać u adumysłowa wykapanyja jamy. Henyja jamy treba kapać tak, kab z ich wada nia łučyła ŭ studniu ci rečku, ci staŭ.

Wada nadta ważnuju maje rolu ŭ raspaŭsiudžwańni tyfusu. Na tyfus chwarejuć nie tamu, što pjuć sahreŭšysia chałodnuju wadu, a tamu, što pjuć wadu niačystuju. Prykład: niechta pje małako. Paśla małaka zachwareŭ ciažka na žywot. Karowa zdarowaja i małako było zusim dobraje. Nichto tolki nie padumaŭ ab tym, što haspadynia nasiła ŭ dajnicy chuścio na raku U chacie spałasnuła dajnicu wadoju sa studni, adnak tam astalisia jašče bakteryi tyfusu. Chaj ciapier niechta napjecca takoha syroha małaka!

Dyk woś čamu treba być hetak aściarožnym z wadoju, dzie pasusiedzku niechta zachwareŭ na tyfus. Usiudy, u cywilizawanych staronkach, dziaržawa rupicca ab sanitarnaj achowie žycharstwa i dziela hetaha rehularna zahadwajuć tam pasyłać wadu da adumysłowych ustanowaŭ bakteryjolohičnych dziela doślédaŭ, ci niama ŭ wadzie bakteryjaŭ tyfusu. Usieńka robicca biasphatna. Pa bolšych miestach, tam, dzie jość wadaprawody, na stancyjach wadaprawodnych kožny dzień pasyłajuć na dośled wadu. Woś miž inšym dzie pryčyna taho, što tyfusu šmat bolš na wioscy.

Kali nia majem peŭnaści, ci wada zdarowaja ci nie, dyk budziem pić, brać da warywa, da pałaskańnia wadu wyklučna pierawaranuju; u wadzie, jakaja kipieła, niama pałačak tyfusu.

Nahlad za chworym u chatniaj abstanoŭcy i ŭmowach asabliwa na wioscy nadta ciažki. Ciažka dla chatnich, — usiaho dobra nia zrobiać, nia hledziačy na kłopaty wialikija. Było-b lepš u lakarni. Kali niemahčyma addać da lakarni, dyk, pa miery mahčymaści, chworaha treba addzialić ad zdarowych, kab źmienšyć akazii da zaražeńnia. Najlepš, kali dahladacimieć chworaha tolki adna asoba. Kali heta ŭletku, a najčaściej tyfus bywaje ŭletku, dyk dobra chworaha z chaty zabrać da kamory, wykinuŭšy ztul usieńka, pakidajučy tolki paściel, zedlik i łožka. Toj, chto dahladaje chworaha, chaj myje akuratna z myłam lizolem ruki, wychodziačy da zdarowych. Dobra kab pry chworym taja asoba była ŭ bałachonie i škidała jaho wychodziačy.

Paściel mianiać jaknajčaściej. Pierad myćciom treba jaje wymačyć u 3%, 5% lyzoli. Inakš lohka moža zarazicca toj, chto mycimie chuścio, nie kažučy ab tym, što budzie z toju rakoju, na jakoj takoje chuścio budzie myć. Usieńka, čym karystajecca chwory, treba dezynfekawać (ačyščać), kali maje toje ŭziać u ruki zdarowy.

Praz usiu ahwarobu da piataha tydnia ježa tolki redkaja abo kaša padobnaja, prykładam: niekalki razoŭ na dzień pa šklancy małaka, poliŭki z mukoju, jajkami, ci mannaju, abo aŭsianymi krupami; kawa, harbata, krychu wina. Tolki na 8—9 dzion paśla harački možna dać sucharoŭ, krychu miasa i pamału wiarnucca da narmalnaje ježy.

Pałaskać (abo wycirać) rot dezynfekcyjnymi lekami. Kali ŭ chacie niama ničoha, dobra mieć paru kaplaŭ jodu na šklanku pierawaranaje wady.

Kali nadta mučaje i abniadužywaje haračka, zrabić wannu na 14°—24° (značycca, uziać wady z chatniaje temperatury); kali niama wanny — paliwać chworaha takoju samaju wadoju

Na zatrymańnie žywata — lewatywu. Kali ž mučajuć nadta hazy ŭ žywacie, abkrucić žywot ručnikami, namočanymi ŭ chałodnaj wadzie. Na wolnaść žywata—kroplaŭ ad wolnaści (opii) pa 20 kroplaŭ 1—2 razy ŭ dzień.

Pry krywatokach lažać na plačoch, lod kłaści na žywot. Mohuć pamahčy i kropli na wolnaść.

Nadta blizkaja i padobnaja da tyfusu chwaroba — paratyfus. Wyklikajecca inšaju bakteryjeju. Abjawy samaje chwaroby amal takija samyja, jak pry tyfusie. Pačynajecca mo' tolki bolš raptoŭna, adnačasna mo' chutčej kančajecca.

Usie zaściarohi adnosna ŭmowaŭ i wymohaŭ sanitarnych i lačeńnia tyja samyja, što i pry tyfusie.

Praces nad biełarusami na pakaz.

Sawiety, jak wiedama, čas ad času robiać sudowyja pracesy pakaznyja. Pracesy hetkija kamunistyčnyja ŭłady zwyčajna arhanizujuć zahadzia, jakija paśla, usioroŭna jak u teatry, razyhrywajucca ŭ Sudzie. Abwinawačanyja na hetkich sudoch, abo złomlenyja stracham ciažkoj kary, abo padkuplenyja abiacańniem swabody, zwyčajna haworać toje, što patrebna Sawietam. Robiać Sawiety hetkija pracesy na toje, kab usiu biadu za niaŭdačy kamunistaŭ u ich palitycy ekanamičnaj i nacyjanalnaj złažyć na kaho inšaha i kab takim čynam ašukawać narod i ŭkrywacca ad jaho hniewu.

Woś-ža ŭ chutkim časie ŭ Miensku hetki praces-teatr maje adbycca nad niadaŭna aryštawanymi biełarusami hramadaŭcami i zmahancami. Zhary možna dahadacca, što ŭsia cikawaść hetaha pracesu budzie ŭ tym, što abwinawačanyja, jak kaža pahaworka, buduć brachać na swoj chwost, buduć „pryznawacca", što jany... nacdemy, ahienty polskaj defenzywy, što ščyra raskajwajucca ŭ swaich „prawinach" i što „prawilnaj" pryznajuć socyjalnuju i nacyjanalnuju palityku sawietaŭ.

Hety pakazny praces nad biełarusami ŭ Miensku maje adbycca adnačasna z takim-ža pracesam nad ukraincami ŭ Charkawie.

Cikawa ŭreščie adznačyć, što jak praces nad biełarusami tak i nad ukraincami maje adbycca byccam u suwiazi z wykryćciem u Sawietach palityčnaj arhanizacyi, jakaja supolnymi siłami biełarusaŭ, ukraincaŭ i litoŭcaŭ imknułasia da poŭnaj niezaležnaści hetych narodaŭ.

Biełaruś adrywajecca ad Sawietaŭ.

Staršynia CIK Sawieckaj Biełarusi Čarwiakoŭ na apošnim zasiadańni CIK SSRR. u Maskwie skazaŭ pramowu, u katoraj wykazaŭ, što Biełaruś ad SSRR. adrywajecca. U hetaj pramowie Čarwiakoŭ napadaŭ na biełaruskich separatystaŭ, abzywajučy ich zdradnikami i prawakatarami, a ŭsio za toje, što chočuć Biełaruś adarwać ad SSRR. Zakidaŭ im, što biaruć hrošy ad zachodnich imperjalistaŭ, a hałoŭna ad fašystaŭskich arhanizacyjaŭ u Polščy i ŭ Niamieččynie. Najbolš łajaŭ Čarwiakoŭ niabožčyka prafesara Ihnatoŭskaha za toje, što jon byŭ siabram hałoŭnych kamunistyčnych orhanaŭ i adnačasna byŭ biełaruskim nacyjanalistam. Jaho adnadumcy, kryčaŭ Čarwiakoŭ, chacieli ŭ praciahu 5 hadoŭ tak źmianić biełaruskuju mowu, kab jana stałasia dla maskaloŭ zusim niezrazumiełaj. Z hetaj pramowy widać, kolki padchalimstwa i lakajstwa ŭ biełaruskich kamunistaŭ prad Maskwoj.

Wykanaŭca zahadaŭ Maskwy Dombal — dyktatar B. S. S. R.

Dawiedwajemsia, što faktyčnym apryčnikam Maskwy ŭ Radawaj Biełarusi źjaŭlajecca ciapier Dombal, palak. Hety dyktatar Sawieckaj Biełarusi pa zahadu Maskwy prawodzić ciapier čystku kamunistyčnaj partyi BSSR i denacyjanalizacyju Ŭschodniaj Biełarusi, a pry hetym, dzie dasca, i polonizacyju biełarusoŭ-katalikoŭ. Hety słuha Maskwy, dušačy biełarusaŭ i ŭsio biełaruskaje ŭ Sawieckaj Biełarusi, kab nie zapynialisia maskoŭskija wialikadziaržaŭnickija ŭpływy, siamtam pašyraje ŭpływy polskaha nacyjanalizmu; hetymi dniami atkryty polskija škoły ŭ zasłaŭskim wokruzie i prywiezieny z Polščy ŭ BSSR. 1.500 tysiač polskich hramafonnych plit. Słowam, Dombal wiedaje, što robić, a rabota jaho dahodna Maskwie i polskamu nacyjanalizmu.

Čarhowaja achwiara ŭ maskoŭska-kamunistyčnaj kataŭni.

Razam z inšymi „hramadaŭcami" i „zmahancami" aryštawany takža i b. pasoł u polski Sojm F. Wałyniec, jaki siadzić u nowazbudawanaj turmie ŭ Miensku, h. zw. „Amerykancy." Nas infarmujuć, što Wałyniec nia wytrymaŭ śledztwa GPU, dzie prawodzicca inkwizycyja, i zwarjacieŭ.

Zabojca Huryna aryštawany ŭ B.S.S.R.

Dawiedwajemsia, što miž inšymi biełarusami aryštawany tak-ža i Klincewič, jaki padčas pracesu Hramady zastreliŭ u Wilni Huryna, što fihurawaŭ u akcie abwinawačańnia Hramady hałoŭnym świedkam. Huryn śpierša byŭ kamunistym, a paśla ich zdradziŭ i byccam šmat čaho wiedaŭ ab Hramadzie. Klincewič za zabojstwa Huryna asudžany polskim sudam na doŭhija hady turmy i abmienieny ŭ Sawiety. Klincewiča balšawiki buduć sudzić za zabojstwa Huryna, na katoraha sami-ž jany i nackawali jaho. Balšawikam, jak bačym, usioroŭna, im aby sudzić!

Kamunisty wysialajuć biełarusaŭ

z Sawieckaje Biełarusi.

U Miensku zwolnili z turmy troch biełaruskich dziejačoŭ: Ściapanowiča, Kaliniča i Knyšyna. Astacca ŭ SSRR. pazwolena tolki Kaliniču, a Ściapanowiča i Knyšyna wysialajuć zahranicu: pieršy jedzie ŭ Francyju, a druhi ŭ Rumyniju.

Sojmawyja wystupleńni polskaj apazycyi.

Hetymi dniami adbyłosia plenarnaje sabrańnie Sojmu, na jakim padniałasia bura; praciŭniki ŭradu padali prapazycyju razhladzieć sprawu bićcia i ździeku palicyi nad sialanstwam zachodniaj i siaredniaj Haliččyny. Heta prapazycyja była śpiešnaj i śpiešnaść jaje matywawaŭ pas. Krysa, zaznačajučy, što padčas pacyfikacyi ŭ Haliččynie addzieły palicyi ździekawalisia nad nasielnictwam. Bili maładych i starych, mužčyn i žančyn. Prociŭ hetaj prapazycyi wystupiŭ uwieś polski Klub B.B. (Дiло № 16, 1934).

— U konstytucyjnaj kamisii padčas razhladańnia sanacyjnaha prajektu źmieny Konstytucyi, sojmawaja - apazycyja wykazałasia ŭsia prociŭ źmieny, pry hetym wostra krytykujučy hety prajekt konstytucyi.

Tajny wajenny sajuz Francyi z Sawietami.

Zahraničnyja hazety padajuć, što miž Francyjaj i SSRR. padpisany tajny wajenny sajuz Francuski min. Pol Bonkur pajedzie da ŭschodnich sajuźnikaŭ Francyi nahawarwać ich, kab prystupili da hetaha sajuzu. Hety sajuz, reč zrazumiełaja, moža dawiaści da wajny. Słowam, prybližajemsia da nowaha wyrašeńnia mižnarodnych spraŭ.

Mandžuryja i Manholija z carom Pu—I.

Paśla ŭtwareńnia „niezaležnaj" Mandžuryi, Japonija imkniecca ŭtwaryć tak-ža „niezaležnuju" Manholiju. Dla hetych dziaržaŭ maje być karanawany na cara Pu—I, ciapierašni prezydent Mandžuryi. Słowam, Japonija ŭ Azii zawodzić paradki paazijacku, a Eŭropa na heta pryhladajecca i tolki plačyma paciskaje.

Sud nad b. wučniami Biełaruskaj Himnazii

ŭ Nawahradku.

Dnia 16 i 17 studnia 1934 h. ŭ Nawahradku adbyŭsia sud nad byŭšymi wučniami Biełaruskaj Nawahradzkaj Himnazii; abwinawačanyja: Hul, Alaksiejewič, Jeŭtuchoŭskaja, Hławinskaja, Chańko, Winar, Černik, Aniščyk, Litwin, Noryk i Haŭrylik. (Noryk i Haŭryli nia byli wučniami himnazii ad 1931-32 školnaha hodu.). Baranili ich adw. Zaštoŭt-Sukiennickaja z Wilni, adw. Pawluć z Nawahradka, adw. Humešer i adw. Roždziestwienski. Sud pryznaŭ usich abwinawačanych winnymi na asnowie pakazańnia Aniščyka i Černika, jakija pryznalisia da winy i zasudziŭ Aleksiejewiča, Chańku i Litwina na 2 hady i 6 mies. z pazbaŭleńniem prawoŭ na 5 hadoŭ, reštu abwinawačanych na 1 hod turmy z pazbaŭleńniem prawoŭ na 2 hady, pryčym Jeŭtuchoŭskaj, Hławinskaj, Noryku, Aniščyku i Černiku kara zawiešana na 3 hady. Pieradsudowy aryšt nikomu nie zaličany. Abarona padała apelacyju.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Uzrost biezrabotnych. U kancy śniežnia 1933 h. wa ŭsiej Polščy naličyli 342 tysiačy asob biezrabotnych. U śniežni 1932 h. było biezrabotnych 212 tysiač. Uzrost biezrabotnych za hod—na 130 tysiač asob. U hetym m-cy naličwajecca ŭ Polščy biezrabotnych 386,825 asob.

Žydoŭskaje wojska. Časta ŭžo spatykajucca ŭ Polščy ŭ haradoch i i miastečkach mašyrujučyja addzieły žydkoŭ. Heta addzieły žydoŭskaj wajskowaj arhanizacyi. Hałoŭnym Kamandantam hetaj arhanizacyi źjaŭlajecca rasiejski žyd Žabotynski, jaki prabywaje ŭ Francyi ŭ Paryžy. Heta arhanizacyja kala Waršawy maje specyjalnuju školu instruktaraŭ, u jakoj wučycca bolš 100 žydkoŭ. Hetyja instruktary, byccam aficery, zakładajuć nowyja wajskowyja addzieły i abučajuć žydkoŭ. Hetkich instruktaraŭ žydoŭskaj wajskowaj arhanizacyi jość u Polščy kala 2000 asob.

„T-wa Raźwićcia Uschodnich Ziamiel." U Polščy mnohija, a polskija palityki dyk i nadta „dbajuć" ab našym Kraju. Niadaŭna zasnawałasia specyjalnaje „T-wa Raźwićcia Uschodnich Ziamiel", jakoje nawiazała łučnaść z „Wilenskim Pramysłowa-Handlowym Sajuzam", ab jakim my ŭ swoj čas pisali, i pačynajuć užo dziejać razam. Słowam, „apiakujucca" z usich bakoŭ.

Adnolkawyja wazy. Hazety padajuć, što Rada Ministraŭ pastanawiła, kab u Polščy byli adnolkawyja wazy. Ab wykanańni hetaj pastanowy budzie asobnaje rasparadžeńnie. Słowam, wazy buduć pad adzin fason

Statystyka narodnych škoł. U Polščy jość u hetym školnym hodzie 27.277 narodnych škoł z wučycialami 80,552 asob. U hetych školach wučycca 4 623.714 dziaciej.

Biezrabotnyja jaduć sabak. Hazety padajuć, što ŭ Łodzi biezrabotnyja jaduć sabak. Nadowiačy byŭ ukradzieny sabaka ŭ Antona Mahlera. Palicyja pačała šukać i rasśledziła, što sabaku ŭkraŭ Walerjan Sulbowič, jaki zabiŭ jaho i źjeŭ. Sud zasudziŭ Sulbowiča na 7 dzion aryštu.

Pomniać ab łužyckich serbach. Hazety pawiedamlajuć, što ŭ Waršaŭskim Uniwersytecie budzie katedra mowy łužyckich serbaŭ. Heta maleńki sławianski narodzik, jaki žywie ŭ Niamieččynie, a jaki ad niamieckaj „apieki" čuć dychaje. Woś-ža Palaki dumajuć „pasabić" jamu hora harawać. Usio heta dobra, ale jšče było b lepš, kab Palaki i na siabie pahladzieli, jak u ich žywiecca biełarusam, litoŭcam i ŭkraincam.

Uzrost biady i ŭzrost pensijaŭ. Polski ŭrad, nia hledziačy na ciažki čas, zamiest abnizić, nadbawiŭ sabie pensii. Ciapier buduć atrymliwać: premjer — 6,450 zał. u miesiac, ministr — 4,300, wice-ministr — 3,225, dyrektar departamentu — 1,750, načalnik addziełu — 1,100 i kiraŭnik referatu — 724 zał. u miesiac. Jak bačym, ništo sabie henych panoŭ miesiačnaja pensyjka, a biednym aby wydzieržać!

Z ZAHRANICY.

Arhanizawanaje sialanstwa pieramahaje. Amerykanskija sialanie, dobra zarhanizawaŭšysia, papraŭlajuć swoj byt. U wakolicach Čykaho sialanie pastanawili padniać canu na małako, bo susim było tannaje i pačali zabastoŭku: nichto nawokał Čykaha na 100 mil nie pawioz i nie panios małaka ŭ horad. Kab wyjhrać zabastoŭku, sialanie zarhanizawali swaju stražu, jakaja zapyniała aŭtamabili, a nawat i ciahniki, dawoziačyja małako zhaloku ŭ horad. Małako padaražeła. Z hetkaj stojkaściaj sialanstwa ličycca i dziaržaŭnaja ŭłada; prezydent Ruswelt zažadaŭ ad parlamantu, kab wyznačyŭ na sialanskija patreby 2 miljardy dalaraŭ i heta suma pojdzie na zapamohu ziemlarobstwa.

Boliwija i Parahwaj wajujuć. Hetyja dziaržawy — respubliki znachodziacca na kantynencie amerykanskim. Jany miž saboju wajujuć užo bolš hohu. Wajna pačałasia za terytoryju, dzie ahledzili naftowyja žaroły. Spiarša hetaja terytoryjaj nichto nie cikawiŭsia. Na Kalady jany byli zaklučyŭšy mir, a pa świacia ŭznoŭ pačali wajawać.

Dalar apadaje. Sučasny prezydent Zł. Št. Ameryki Ruswelt specyjalna wiadzie da abnižeńnia wartaści dalara. Dalar U S.A. maje abnizicca da paławiny dasiulešniej swajej cany.

Hoład i śmierć. U Wienie (Aŭstryja) apublikawana brašura d-ra Amende ab hoładzie ŭ SSRR. D-r Amende dakazwaje, što ad hoładu ŭ Sawietach pamiorła 5—6 miljonaŭ narodu.

Bałtycka-Biełamorski kanał — 140.000 mučanikaŭ. Letaś balšawiki končyli budawać Bałtycka-Biełamorski kanał, jaki złučaje Bałtyckaje mora z Biełym moram. Hety kanał daŭžynioj 226 kilometraŭ zbudawany praz paŭtara hodu. Kapali kanał 150.000 niawolnikaŭ — niaščasnych sasłancaŭ, jakija swaimi rukami pierakapali 7 miljonaŭ kub. metraŭ ziamli i 2 miljony kub. hranitnaj skały. Padčas hetaj ciažkaj kataržnaj pracy zhinuła pry budowie kanału 140 000 asob, mahiły jakich ablahli abapał praz usiu daŭžyniu kanału.

Rańniaja wiasna i haračaje leta. Byŭšy prafesar marskoj akademii ŭ Budapešcie d-r M. Hanko apublikawaŭ swaje praroctwy ab pahodzie ŭ najbližejšych hadoch. Jon prarakuje, što studzień, luty i sakawik siol. h. buduć pahodnyja, biez wialikich marazoŭ. Wiasna budzie rańniaja, leta budzie haračaje. Leta 1935 h. budzie chałodnaje. Strašennyja śpieki buduć u 1943 h. Ad 1945 h. temperatura budzie panižacca i ŭ 2000 hodzie budzie śmiarotny choład. Jasnaja reč, što my nie dačakajem, kab da kanca prawieryć, ci praŭdu kaža praf. Hanko.

Z KRAJU.

Wybary ŭ hminnyja rady. Ciapier adbywajucca wa ŭsim Kraju wybary ŭ hminnyja rady. U niekatorych pawietach wybary zakončany, a ŭ niekatorych jašče adbywajucca. Adbywajucca jany tak, jak adbylisia ŭ rady hramadzkija; zacikaŭleńnie ŭ sialanstwie hetymi wybarami nijakaje, bo jany adbywajucca tolki ŭ peŭnym kruhu „wybranych" asob u hramadzkija rady.

Na hetu halinu hramadzkaha žyćcia adnak treba zwaročwać bolš ŭwahi i ŭ hetaje žyćcio ŭwachodzić treba kožnamu, chto moža pracawać na hramadzkaj niwie.

Žachliwyja zdareńni. U w. Žyźniewo, Wialejskaha paw., nadowiačy padčas ćwičeńnia Stralcoŭ zastreleny stralec Wacł. Łubnieŭski. Zdareńnie henaje — niasumysnaje.

Kala Lidy, miž Gaŭjaj i Lidaj, najechaŭ ciahnik na furmanku. Skutkaŭ strašnych nia było.

Piśmy z wioski.

Baraćba za rodnuju školu, — naš wučyciel.

w. Suknievičy, Ašmianskaha paw. Heta ahramadnaja wioska, naličaje kala 100 damoŭ. Žywuć u joj Biełarusy — prawasłaŭnyja i kataliki, na paławinu adnych i druhich. Kataliki, praŭda nia ŭsie, — praz niaświedamaść swaju pišacca jašče „Palakami“. Apošnim časam i ŭ ich pranikaje zrazumieńnie, što pamima prynaležnaści da katalickaha kaścioła i da polskaj dziaržaŭnaści jany jość Biełarusami. — Sukniewičy słaŭnaj wioskaj stalisia za swajo hierojskaje zmahańnie za biełaruskuju školu. Heta było ŭ časie, kali Biełarusy ŭ Zachodniaj Biełarusi składali masowa deklaracyi. Aproč žycharoŭ w. Sukniewičy, brali haračaje ŭčaście ŭ składańni deklaracyjaŭ dziela adčynieńnia biełaruskaj školy ŭ w. Sukniewičach takža žychary susiednich wiosak: Piarebnawičy i inš. Na pačatku było złožana deklaracyjaŭ na 60 dziaciej, a paźniej, kali hmina zažadała apłaty za zawierańnie podpisaŭ pad deklaracyjami, na40 dziaciej. U wyniku takoha damahańnia rodnaj biełaruskaj školy — *školy biełaruskaj školnyja ŭłady nie adčynili.* Inspektar školny, jaki ŭ toj čas pryjechaŭ u Sukniewičy na „badanie“, skazaŭ, što *biełaruskaj školy nia budzie, a budzie t. zw. utrakwistyčnaja biełaruska-polskaja.*

Adnak, mima hetaha, da siahońniašniaha dnia ŭ w. Sukniewičach *niama školy ani čysta biełaruskaj, ani miašanaj biełaruska-polskaj*, a jość škoła polskaja, z jakoj karyść, jak — prykładam — z kazła małaka.

A heta-ž polskaja škoła isnuje ŭ nas užo dobruju dziesiatku hadoŭ. Siahońnia naličaje kala 117 dziaciej. Byli ŭ joj roznyja wučyciali, błahija i dobryja, roznych charaktaraŭ i dumak. Ad 1929 h. da siahońniašha dnia kiraŭnikom hetaj školy źjaŭlajecca p. St. W., čaławiek niatutejšy, a pryjezžy z Halicyi. Pamima taho, što jon užo ŭ nas doŭhi čas, nia moža adnak zžycca z ludźmi.

U minułym hodzie jon (ale chiba nia jon, ale načalstwa jamu prykazała) załažyŭ u našym abwodzie t. zw. „Koło T-wa Popierania Budowy Publičnych Szkół Powszechnych“. Ludzi ničoha prociŭ nia mieli-b, *kali-b škoła była pabudawana ŭ Sukniewičacḫ, abo ŭ inšaj wioscy našaḫa školnaḫa abwodu.* Ale dziela taho, što — jak ćwierdziać niekatoryja žychary — składkowyja hrošy (4 zł ŭ hod i 50 hr. ustupnych), jakija źbiraje wučyciel ad siabroŭ henaha „Koła“ majuć pajści na budowu školaŭ raniej ŭ centralnaj Polščy, čym u nas — siabry henaha „Koła“ nieachwotna płaciać składki, a to j zusim nia płaciać abo wypisywajucca z taho „Koła“. Bajacca ludzi ašukanstwa.

Ale ab hetym i ab inšych sprawach pahaworym u nastupnym ci paźniejšym numary „B. Krynicy“.

Suknieŭski.

Z rubiaža biełaruskaj ziamli.

m. Chorašč, Biełastockaha paw. U Biełarusi hetakich miastečak, jak Chorašč, naličyć možna socieniak niekalki. Bo čymža takaja Chorašč rožnicca ad takoha Wałožyna, ci Wišniawa, ci Lebiedziewa, ci biaz liku druhich u nas niewialičkich miastečak? Tolki chiba taja miž imi rožnica, što Chorašč lažyć na kraju Biełarusi, pad samaj Narwaj, tady, kali druhija miastečki hdzie papała razsypalisia pa ŭsiej, jak šyrokaja, našaj ziamielcy.

U daŭnym prošłym usie našy miastečki zakładalisia i padtrymoŭwalisia wialikimi panami. Zakładali ŭ nas miastečki — pany biełaruskija, polskija. litoŭskija, a nat i rasiejskija.

Daŭniej i ŭ Choraščy žyŭ wialiki pan Mikałaj Pac, słaŭny z taho, što jamu ŭzdumałasia być wilenskim biskupam. A tady wilenskaje biskupstwa było wielmi smačnym kusočkam, bo nadta było bahataje i šyrokaje. Hety Mikałaj Pac raźwioŭsia tady sa swajej žonkaj i dziesiać hadoŭ zmahaŭsia, kab dabicca henaha biskupstwa. Swaju metu jon asiahnuŭ i byŭ jašče dziesiać hadoŭ wilenskim biskupam.

U Choraščy siahońnia ad pałaca henaha Paca na tym miejscu astalisia adny tolki kamieńni.

Chorašč najlepiej ćwicieła pierad wajnoj. Niemiec Moas raźwiŭ tam swaju wialikuju fabryku sukna. U henaj fabrycy, praŭda, dyrektarami i hałoŭnymi rabotnikami byli niemcy, ale i našym ludziam hrašej dastawałasia tady ŭdowal.

Ale woś pryšła wajna. Ludzi swaich kapitałaŭ nia wyniali z bankaŭ i praz heta ŭ wadzin momant jany astalisia biez hraša pry dušy. Hetu trahiedyju dobra ŭsie pomniać ciapier u Charoščy.

Uznoŭ padčas wajny, jak wiedama, usio na świecie rožna krucilasia— mucilasia, dyk i ŭ Charoščy našaj wyšła tak, što hena słaŭnaja fabryka Moasa pieratwaryłasia ŭ wialiki špital dla chworych rozumam. Ciapier u heny špital prywiaźli z Waršawy tysiaču durnych i hetak zawalili imi ŭsiu Chorašč Mienš chworych sa špitala haspadary na zarabotki biaruć u swaje chaty, pa čatyroch chworych pierawažna. Haspadary za heta majuć płatu pa 30 zł. ad chworaha. Raz niechta takoha na wioscy chworaha zapytaŭsia: „Hdzie lepiej ci ŭ špitali, ci ŭ haspadara na wioscy? A chwory adkazywaŭ: „Jak ja byŭ u špitali, to nia moh noh ciahać, a ciapier u haspadara mahu lohka zrabić dzienna dziesiać kilametraŭ.“ Chworyja narakajuć, što ŭ špitali ich drenna kormiać.

Apošnim časam naša Chorašč wostra pachililasia ŭ polski bok. Našu słaŭnuju čyrwonuju wulicu pierajmienawali na wulicu Mickiewiča, a staruju žoŭtuju wulicu nazwali wulicaj Maršałka Piłsudzkaha. Daŭniejšy rynak ciapier zawiecca rynkam 11 listapada. Jość u nas i wulica Kaściuški.

U Charoščy ciapier nadta mocny „stralec.“ Pracaŭniki nižšaj rangi ŭ špitali — usie stralcy. Ale stralcu nie paddajecca i S.M.P. Charaščanskija miaščanie nia lubiać pryznawacca da biełaruskaj mowy. Mnie raz udałosia padsłuchać, jak adna miaščanka źwiarnułasia da swajho muža: „Padaj mnie balejku.“ A muž da jaje: „A hdzież jana staić, — jakuju?“ Papolsku haworać u nas nadta ćwiordym akcentam, sa zwarotami biełaruskimi.

Niadaŭna ŭ Charoščy ihrali biełaruskija spektakli! Ksiandza Rešecia, słaŭnaha biełarusa, usie tut dobra znajuć nadta jaho tut lubiać i pawažajuć. Wioska Ruščany, u jakoj Ks. Rešeć hadawaŭsia, — adna tolki wiarsta ad Charoščy.

Daj Boža, kab takich ksiandzoŭ, jak Rešeć, było jaknajbolej u nas kala Charoščy!

D—a.

Dziawočaja pomsta. U w. Listunach, Wil. wajawodztwa, stałasia niazwyčajnaja padzieja. U chatu wiedamaha wa ŭsiej wakolicy zwodnika dziaŭčat Fr. Marčuka pryšło čatyroch dziaŭčat, jakija źwiazali Marčuka i wyłažyli. Marčuka pawieźli ciažka chworaha ŭ špital, a čatyry „operatarki“ padany pad sud.

Waŭki, miadźwiadzi, dziki i babry. Kraina naša bahata na źwiaroŭ. U Dzisienskim paw. nadajadajuć waŭki: zabirajuć sabak i łaziać u chlawy pa žywiołu. Buduć tam rabić abławu. U Łuninskim paw. rabotniki ŭ lesie ŭzbudzili miedźwiadzia, jaki raździor adnaho rabotnika Ahuzowiča. Rabotniki zaraz ža pačali rabić na „misiu“ abławu. Miadźwiedź ciažka raniŭ dwuch zahaniatych i mocna abdzior sielanina Chalewiča. Abławu spynili i dali „misiu“ supakoj. U Słonimskim pawiecie žywuć babry. Z Wałožynskaha pawietu padajuć, što tam całymi stadami chodziać dziki (dzikija świni).

Прамень сьвятла.

Гэрманавічы, Дзісьненскага пав. Непрабудная цемра ў нашых ваколіцах. Сьвятла ніадкуль ня было відаць, але вось крыху праясьнела і прамень сьвятла заглядае ў сумную душу. нашага сялянства. Гэтую цемру разганяе ў нас „Беларуская Крыніца“, якая гадуе людзей на сьведамых грамадзян краю. Гарыстая і камяністая дарога ў нас для „Бел. Крыніцы“, аднак, яна ўпорыста йдзе і хоць змучанай, але здаровай на духу прыходзіць да нас і пакрапляе слабых, паказвае дарогу мацнейшым ды бязупынна прасьвячае цемру, якая так даўно пакрыла нашу старонку.

Смаш.

Аб нашых падзеях.

Іказьнь, Браслаўскага пав. У нядзелю 7 г. м. С. М. П. ладзіла ў сваім „штабе“ польскае прадстаўленьне. На прадстаўленьне гэнае ня ўсе ходзяць, бо мала хто цікавіцца польскімі прадстаўленьнямі. Нават „слышоў“ (гэтак у нас называюць вясковых сяброў С.М.П.) ня было; не памагаюць ужо і ксяндзоўскія прыказы. Першыя часы, як толькі прыехаў да нас кс. В. Лабан і павёў сваю полёнізатарскую працу, „слышоў“ зьбіралася поўная заля; у часе прадстаўленьня набіраліся яны польскай культуры, „духова“ падмацоўвалі яе самагонкай, а ў часе скокаў выладоўвалі яе адзін другому на галаве, але ўжо не „духова“, а фізычна.

Сам галоўна амандуючы С.П.М. кс В. Лабан прызнаўся, што з гэтай моладзі „не дасень ніц зробіць“ і пачаў ставіць сваім „члонкам“, у прыклад сьведамых беларусаў.

Але ягоныя сябры нічога не навучыліся і ня вынясьлі са „штабу польскасьці“ нічагуткі польскага: якімі прышлі нясьведамымі, такімі і пашлі. Нават адзін ксяндзоўскі гадунец моцна дзівіўся, што кс. Лабан крытыкуе нашу мову. Відаць, што ён шапкай вышэйшы за свайго вучыцеля. Аб гэтым гавораць бадай усе нашы людзі, а дзеля гэтага моладзь масава выступае з ксяндзоўскай арганізацыі, хоць праўду кажучы, яна ў яе і не ўступала, бо кс. Лабан ня пытаўся, ці хочаш належыць да С.М.П. ці не, але запісваў і баста.

Цяпер ксяндзоўскае вогнішча раздзьмухваюць усяго два сябры. Адзін Яська Пурвінь, а другі Станіслаў Граховіч.

Дык вот яны 7 г. м. павялі атаку проціў усяго беларускага, але на іх ніхто не зварочваў увагі. Зразумела што моладзь абурылася і ледзь яе супакоілі старэйшыя; хацелі гэных астаўшыхся стаўбоў „огніска“ выкідаць праз вокны.

Дарагая моладзь, адкажы працаўнікам беларушчыны позытыўнай і культурнай працай.

Пуга.

Крыху з нашай ваколіцы.

Ёды, Браслаўскага пав. Польскія санацыйныя газэты галасна пісалі аб выбарах у самаўрады. Але ў нас гэтыя выбары прайшлі незаметна, бо адбыліся пераважна без галасаваньня.

Зразумелая рэч, што нашы сяляне гэтымі выбарамі моцна нездаволены, бо гэткіх выбараў у нас яшчэ ня было. Але пражывём і гэта, як пражылі многа чаго.

І. П.

Z Wilni.

Sprawa kaściej Witaŭta Wialikaha. Litoŭskaja hazeta „Rytas“ padaje, što hrupa asob u Koŭnie pastanawiła pryjechać u Wilniu i pačać pierahawory ŭ sprawie wydańnia Litwie kaściej Witaŭta Wialikaha.

Ab hetym užo pisali hazety i wilenskija, što nawat u Čechasławaččynie kuplena adpawiednaja truna, jakaja prywieziena ŭ Wilniu, ale, jak piša „Rytas“, Polšč admowiłasia wydać Litwie kości Witaŭta Wialikaha. U Koŭnie spadziajucca, što ciapier udasca Litoŭcam dajści da parazumiennia z Palakami ŭ hetaj sprawie.

Paštowaja skrynka.

Maładečancu. Atrymali i moža pry nahodzie skarystajem, pišycie ab žyćci ŭ Wašych wakolicach, hetkija wiestki buduć cikawiejšyja.

Bieluku. Niachaj dačka kančaje 6 addziełaŭ paŭšechnaj školy, a tady pojdzie ŭ himnaziju. Z karespandencyi skarystajem, pašyrajcie świedamaść.

Šumščaku. Ab wybarach užo mnoha pisali, ale pastarajemsia skarystać i z Wašaj karaspandencyi, pišycie ab žyćci sialan i pašyrajcie siarod ich nacyjanalnuju świedamaść.

Sinkiewiču A. Atrymali, dziakujem, što možna nadrukujem, ale ŭsiaho nia zmožam z pryčyn ad nas niezaležnych. Hazetu pasyłajem i pasyłać budziem, z apłataj pačakajem. Pisiem ad Was, aproč hetaha, nie atrymali, cikawa, kudy jany dziajucca. U sprawie dakumantaŭ lepš źwiarnucca praz Min. Zahr. Spraŭ. Pišycie ab nastrojach kala Was.

N. Pahoskamu. Karespandencyju atrymali, dziakujem, krychu zadoŭhaja, skarocim i skarystajem, pišycie karaciej i tolki ab ważniejšych sprawach. Hazetu pasyłać budziem, pašyrajcie świedamaść narodnuju, a praz jaje zbudujem i lepšy byt materjalny.

S. B. Dziakujem, skarystajem, ale skaraciŭšy, bo nadta-ž doŭhaje apisańnie.

Prešuku. Carkoŭnych propawiedziaŭ biełaruskich palicyja zabaranić nia moža, damahajciesia adkryta i palicyi nia bojciesia, heta sprawa da palicyi nie naležyć.

Jak Wy abchodziciesia biez „BIEŁARUSKAJ KRYNICY“?

Užo kožny świedamy Biełarus jaje wypiswaje i čytaje. — Kali Wam zaciažka płacić za hazetu adnamu, dyk wypiswajcie „Biełaruskuju Krynicu“ na supałku z susiedam u składčynu.

Wydawiectwa „Biełaruskaj Krynicy“, kab pašyryć drukawanaje słowa ŭ rodnaj mowie, daje swaim padpiščykam premiju ŭ formie biełaruskich knižak.

Termin prysyłki zapłaty za hazetu, dziela dahodnaści padpiščykaŭ, pradaŭžajecca.

Cḫto pryšle da 15 lutaḫa padpisku na „Biełaruskuju Krynicu“ na 1934 ḫod 4 zł. i 2 zł. na wysyłku premii, razam 6 zł., toj atrymaje kniḫu 3 kilo waḫi —

В. Ластоўскага: ГІСТОРЫЮ БЕЛАРУСКАЙ (КРЫЎСКАЙ) КНІГІ.

Cḫto pryšle da 1 sakawika s. ḫ. padpisku ŭ sumie — 4 zł. i na pierasyłku premii 50 ḫr. toj atrymaje 5 biełaruskicḫ knižak:

1) Новая Зямля і 2) Сымон музыка — *Якуба Коласа.*
3) Z Rodnaha zahonu — *Andreja Ziaziuli.*
4) Kaniok Harbuniok — *W. A.*
5) Ziemlarobskaja čytanka. — *inž. Ad. Klimoviča.*

Adres Red. i Adm. „Bieł. Krynicy“ Wilno, ul. Zawalna 1—1.

У ТРАДЫЦЫЙНЫ КАНЦЭРТ-БАЛЬ

3-ох СТУДЭНСКІХ САЮЗАЎ:
БЕЛАРУСКАГА,
ЛІТОЎСКАГА і
УКРАІНСКАГА,

адбудзецца 10 лютага с. г. у залі Літоўскай Гімназіі ім. Вітаўта Вялікага — Вільня, Домброўскага 5.

Даход празначаны для незаможных студэнтаў на аплату за навуку.

Redaktar: Jan Paźniak — Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 3. — Wydawiec: A. Šutowič